## 4 КРАСАВІКА Даты Падзеі Людзі




**1557** год — нарадзіўся (м. Астроўна Віцебскага павета) Леў Іванавіч Сапега, дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага. Падканцлер і канцлер вялікі літоўскі, ваявода віленскі. Яго дзейнасць аб'ектыўна спрыяла развіццю і ўмацаванню на Беларусі ў 2-й палове XVI ст. прагрэсіўнай свецкай сацыяльна-палітычнай думкі. З імем Льва Сапегі звязваюць падрыхтоўку і выданне ў 1588 годзе Трэцяга Статута Вялікага Княства Літоўскага і стварэнне ў 1581 годзе Галоўнага Трыбунала — найвышэйшай судова-апеляцыйнай інстанцыі дзяржавы.

**1945** год — нарадзіўся (в. Петрашунцы Валожынскага раёна) Віктар Іванавіч Карзюк, беларускі матэматык, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Аўтар больш за 200 навуковых прац. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 1996 года за цыкл работ «Аператарныя метады ў дыферэнцыяльных ураўненнях». Заслужаны работнік адукацыі Беларусі.




**1932** год — амерыканскі біяхімік Чарльз Глен Кінг упершыню выдзеліў вітамін С у выглядзе крышталічнага рэчыва з «венгерскага» перца і высветліў яго эмпірычную (C6H8O6) і структурную формулы. У арганізме чалавека ўдзельнічае ў акісляльна-аднаўленчых рэакцыях, стымулюе ўнутраную сакрэцыю, нармальнае развіццё і супраціўляльнасць арганізма, садзейнічае рэгенерацыі тканак. Адсутнасць або недахоп аскарбінавай кіслаты ў ежы чалавека выклікае цынгу, зніжае супраціўляльнасць да хвароб.

**1968** год — адбылося забойства барацьбіта супраць расавай дыскрымінацыі, Нобелеўскага лаўрэата Марціна Лютэра Кінга. Яго выступленні лічацца класікай прамоўніцкага майстэрства. Асновай барацьбы гэтага дзеяча было негвалтоўнае супраціўленне. Шырокую вядомасць атрымала прамова Кінга «Я маю мару» (анг. I have a dream), якую ён абвясціў падчас Маршу на Вашынгтон каля манумента Лінкальну. Яе слухалі каля 300 тысяч чалавек.